УДК 821.161.3

**Калеснікава Ірына Аляксандраўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі
“Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва”
(г. Магілёў, Беларусь)

# МАЎЛЕНЧЫЯ «ТРЫГЕРЫ» Ў ПАЭМЕ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА «СЦЯГ БРЫГАДЫ»

У артыкуле па-новаму разглядаюцца цытаты і выразы з паэмы Аркадзя Куляшова “Сцяг брыгады”, якія могуць паспяхова выкарыстоўвацца на занятках па беларускай літаратуры і ў навукова-даследчай дзейнасці.

Заахвоціць моладзь да чытання класічных твораў беларускай літаратуры ў наш час становіцца складанай задачай, з якой справіцца можа толькі прафесіянал. Кожны педагог імкнецца выкарыстоўваць метады і прыёмы, што дазволяць зрабіць карыснай і якаснай працу над тэмай. Прапаную звярнуцца да даволі цікавай з пункту гледжання псіхалогіі формы – трыгер.

Сёння пад трыгерам разглядаецца стымул, які нагадвае нам пра тое, што адбылося раней, і выклікае ўспаміны. Такім стымулам можа быць што заўгодна: чалавек, месца, падзея, навіна, фільм, песня або прадмет. Яны прабуджаюць успаміны і ўплываюць на настрой [пераклад мой – І.А. Калеснікава]. [2]

Адна з задач мастацкай літаратуры – эмацыянальнае ўздзеянне на рэцыпіента. А калі чалавек мае багаты жыццёвы або чытацкі вопыт, уздзейнічаць на яго зацікаўленасць па-сапраўднаму могуць толькі так званыя «трыгеры».

Пад трыгерамі паэмы Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады» варта разумець цытаты і выразы, з дапамогай каторых утвараюцца самыя яркія вобразы ў свядомасці чытача. Тыя вобразы, што не страчваюць сваёй актуальнасці і па сённяшні дзень. Такія «трыгеры» можна знаходзіць у розных творах мастацкай літаратуры з арыентацыяй на вучнёўскі або студэнцкі калектыў.

З паэмы А. Куляшова мною былі вызначаны цытаты-трыгеры, якія адлюстроўваюць жахі вайны. Педагогу або загадзя падрыхтаваным вучням прапануецца зачытаць іх пры вывучэнні твора на этапе актуалізацыі ведаў з мэтай эмацыйнага водгуку слухачоў, прыцягнення вучнёўскай увагі да праблемы генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчын-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

най вайны: «…родны Мінск я пакінуў, / нямецкай бамбёжкаю гнаны…», «…родны горад гарэў, / і не ведала сэрца спакою…», «…самалёты ляцяць адусюль, / дзецям смерць пагражае…», «…агню языкі / ліжуць ліпы салодкае лісце…», «…мне акопы відны, / бліндажы па чатыры накаты…», «…апусцелі двары, / вокны насцеж, / закрэслены шыбы…», «…мы ваюем адны, / без дапамогі, / акружаным станам…», «…хоць хацеў бы я, / не апішу бой за ўзгорак, / за рэчку…», «…бамбіць налятала / па сем самалётаў на хвою…», «…кулямётчык забіты ляжыць / за сваім кулямётам…», «…па роднаму полю варожыя ходзяць мінёры…», «…танкі гусеніц жорнамі / жыта пасля памалолі, / коні потныя, чорныя / хлеб замясілі на полі…», «…ні гасцінца я для дзяцей не прынёс, / як прыносіў даўней. // Я ад кожнага вока прынёс / родным дзецям па жмені слёз…», «…там дзяцей, / там бацькоў і жанок / закапалі жывымі…», «…Я пазнаць не магу / аніяк стрэчнай вёскі... // Дзе школа? Вятрак? // Дзе знаёмыя хаты?.. // Адны сярод поля / тырчаць каміны…», «…– Чаго ж табе (хлопчыку) трэба? – Кавалачак хлеба» [1].

Кожны з трыгераў варта падмацоўваць выявамі, відэа або музычным суправаджэннем, таму што для сучаснай моладзі неад’емнай часткай уключэння ў пазнавальную дзейнасць з’яўляецца візуалізацыя інфармацыі. Для гэтага мною распрацавана прэзентацыя «Ілюстрацыі да цытат з артыкула «Маўленчыя «трыгеры» ў паэме Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады» (https://cloud.mail.ru/public/WicE/ELtvmhOAC).

Паэма Аркадзя Куляшова насычана вобразамі-трыгерамі рознай тэматыкі: жахі вайны, любоў да радзімы і сям’і, маральна-этычныя і інш. Але найбольш значнымі, на маю думку, з’яўляюцца менавіта першыя з іх: Вялікая Айчынная вайна аказала сур’ёзны ўплыў на ўсе сферы жыцця, але запомнілася стратай кожнага трэцяга беларуса і зламанымі лёсамі выжыўшых. Сёння мы павінны зберагчы ў свядомасці і ніколі не паўтарыць тыя падзеі, якія так старанна заносіў у дзённік салдацкіх будняў сапраўдны патрыёт – лірычны герой паэмы “Сцяг брыгады” Алесь Рыбка.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Куляшоў, А. А. Сцяг брыгады / А. А. Куляшоў // Збор твораў у двух тамах. Том II / А. А. Куляшоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1957. – С. 92-136.
2. Лунёв, Д. Что такое триггер / [Электронны рэсурс.] // – Рэжым доступу : https://skillbox.ru/media/growth/trigger-in-psychology/. Дата доступу : 30.03.2025, 19:40.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова